# Метадычны каментарый да вучэбнага дапаможніка "Музыка"

*(Працяг. Пачатак у № 11/2016.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**III чвэрць**

**З ЧАГО ВЫРАСЛА МУЗЫКА?**

**Урок 17**

***З чаго пачынаецца музыка?***

**С. 66:**

Што вы можаце расказаць пра музыку старажытных людзей, гледзячы на малюнкі? З чаго раней выраблялі інструменты? На што падобныя гэтыя інструменты? Як на іх гралі?

**С. 67:**

Паслухайце песні, што выконваліся народам у час працы. Падумайце, навошта людзі выконвалі пастуховыя найгрышы, навошта спявалі ў час касьбы, жніва.

**С. 68—69:**

Разгледзьце малюнкі. Сюжэт якой казкі зацікавіў кампазітара Цэзара Кюі? Як называўся музычны спектакль, які напісаў кампазітар? Хто прымаў удзел у спектаклі? Паслухайце музычны ўступ да оперы Цэзара Кюі "Кот у ботах". Да чаго рыхтуе слухачоў музыка? Гучанне якіх інструментаў вы пазналі?




→ Першакласнікі атрымліваюць уяўленне аб тым, што для прафесійнага стварэння музыкі неабходны кампазітар, які, захоплены нейкім сюжэтам, складзе музыку і запіша яе нотамі. Далей патрэбны выканаўцы, якія агучаць (сыграюць ці праспяваюць) тое, што напісаў кампазітар. А таксама важныя слухачы, якія ацэняць і палюбяць прыдуманы кампазітарам твор.

**Урок 18**

***Песня, танец, марш***

**С. 70—71:**

Разгледзьце малюнкі. Чым занятыя дзеці? Развучыце папеўкі "У нашым класе" Дзмітрыя Кабалеўскага. Выканайце іх выразна.

→ У ходзе працы над папеўкамі вучні даведваюцца пра "трох кітоў", на якіх трымаецца ўся музыка: песню, танец і марш.

**С. 72—73:**

Разгледзьце малюнкі. Што выконваюць гномікі на кожным з малюнкаў? Што вам дапамагло адказаць на пастаўленае пытанне?

Развучыце "Песеньку пра гномікаў" (словы і музыка В. Каваліва). З якім настроем трэба выконваць гэтую песню? Паспрабуйце дасягнуць патрэбнага характару выканання.

Разгледзьце схемы. Звярніце ўвагу на размяшчэнне званочкаў у кожным выпадку. Выканайце прыпеў "Песенькі пра гномікаў", сачыце за рухам гукаў па схемах.

**Урок 19**

***Жывы пульс музыкі***

**С. 74:**

Разгледзьце малюнкі. Уявіце, як рухаецца маятнік у гадзінніку. Пакажыце яго рух рукой. А цяпер уявіце, як гушкаюцца на арэлях дзеці, як разгойдвае звон званар. Што агульнае ва ўсіх гэтых рухах?

→ Выконваючы заданне, вучні знаёмяцца з паняццем "раўнамерная пульсацыя".

Назавіце прадметы, прадстаўленыя на малюнках. Прагаварыце кожнае слова па складах, адначасова пляскаючы ў далоні. Націскны склад вымаўляйце гучней, ненаціскны — цішэй.

→ Увага вучняў звяртаецца на схематычнае абазначэнне доляў: націскны склад (моцная доля) пазначаецца зафарбаваным кружком, ненаціскны склад (слабая доля) — незафарбаваным.

**С. 75:**

Прачытайце назвы музычных інструментаў. Колькі ў кожным слове складоў? На які склад падае націск? Прагаварыце кожнае слова па складах, суправаджайце кожны склад воплескам. Моцныя долі вымаўляйце гучней, слабыя — цішэй. Запомніце назву кожнага інструмента.

**С. 76:**

Назавіце прадметы, прадстаўленыя на малюнках. Колькі ў кожным слове складоў? На які склад падае націск? Прагаварыце кожнае слова па складах, суправаджайце кожны склад воплескам. Моцныя долі вымаўляйце гучней, слабыя — цішэй.

→ Увага вучняў звяртаецца на схематычнае абазначэнне доляў пры трохдольнай пульсацыі: націскны склад (моцная доля) пазначаецца зафарбаваным кружком, ненаціскныя склады (слабыя долі) застаюцца незафарбаванымі.

**С. 77:**

Разгледзьце першую схему. Як чаргуюцца моцныя і слабыя долі? Якія гучальныя жэсты пазначаны ў схеме? Які жэст трэба выконваць гучней, а які цішэй? Агучце схему.

Разгледзьце другую схему. Якія музычныя інструменты ў ёй пазначаны? На якім інструменце трэба іграць гучней, а на якім цішэй? Каму па схеме даручаецца выкананне моцных доляў — хлопчыкам ці дзяўчынкам? Каму па схеме даручаецца выкананне слабых доляў? Агучце схему.

Разгледзьце трэцюю схему. Якая пульсацыя ў ёй выкарыстана: двухдольная або трохдольная? Якім жэстам трэба выконваць моцную долю, а якім слабыя долі? Агучце схему.

Разгледзьце чацвёртую схему. Якія музычныя інструменты ў ёй пазначаны? На якім інструменце трэба выконваць моцныя долі, а на якім слабыя? Каму па схеме даручаецца выкананне моцных доляў? Каму па схеме даручаецца выкананне слабых доляў? Агучце схему.

### Урок 20

***Якія бываюць маршы?***

**С. 78:**

Разгледзьце два верхнія малюнкі. На якім з малюнкаў паказаны дружны, арганізаваны рух? Растлумачце свой адказ.

Разгледзьце наступныя два малюнкі. Што на іх намалявана? Паслухайце два маршы. Здагадайцеся, калі будзе гучаць ваенны марш, а калі спартыўны. Звярніце ўвагу, як і з чым у руках маршыруюць вайскоўцы.

→ Вучням прапануецца паслухаць фрагменты двух маршаў: "Футбольны марш" Мацвея Блантэра і "Развітанне славянкі" Васіля Агапкіна.

**С. 79:**

Разгледзьце малюнкі ў рамачцы. Запомніце назвы інструментаў ваеннага духавога аркестра.

Развучыце песню. Суправадзіце песню гучальнымі жэстамі або ігрой на музычных інструментах.

→ Вучні развучваюць адну з песень з маршавым характарам музыкальнай мовы. Напрыклад, "Барабан" (словы Б. Жанчака, музыка Л. Сімаковіч) альбо "Бравыя салдаты" (словы Т. Волгінай, музыка А. Філіпенкі).

Разгледзьце першую схему. Якім жэстам трэба агучваць моцныя долі, а якім слабыя? Агучце схему.

Разгледзьце другую схему. Колькі інструментаў павінна ўдзельнічаць у агучванні моцных доляў? Назавіце гэтыя інструменты. Які інструмент павінен агучваць слабыя долі? Выканайце інструментальнае суправаджэнне песні па схеме.

**С. 80:**

Разгледзьце малюнкі. Якая музыка падыдзе кожнаму з іх? Якім інструментам вы даручылі б выконваць марш волатаў, а якім — марш посуду?

**С. 81:**

Разгледзьце першую схему. Якія гучальныя жэсты павінны перадаваць моцныя долі, а якія слабыя? Агучце схему.

Паглядзіце на другую схему, параўнайце яе з першай. Чым адрозніваюцца гэтыя схемы? Звярніце ўвагу на выкананне слабых доляў. Агучце схему спачатку вельмі павольна, затым хутчэй і вельмі хутка.

Разгледзьце трэцюю схему. Якія інструменты ў ёй пазначаны? Агучце схему.

Разгледзьце чацвёртую схему. Параўнайце яе з папярэдняй схемай. Чым яны адрозніваюцца? Агучце схему.

### Урок 21

***Якія бываюць танцы?***

**С. 82—83:**

Разгледзьце малюнкі. Апішыце, якія танцы выконваюць людзі. Паслухайце два музычныя фрагменты. Вызначце, да якіх малюнкаў падыходзіць кожны музычны нумар.

→ Вучням прапануецца паслухаць два музычныя нумары, што адносяцца: адзін — да прыдвор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

най музыкі XVII—XVIII стст.; другі — да балетнага мастацтва XIX ст., напрыклад "Куранта" з Астрамечаўскага рукапісу, вядомага пад назвай "Полацкі сшытак", і "Вальс" з балета П. Чайкоўскага "Спячая прыгажуня". Магчымы і іншы падбор твораў.

**С. 84—85:**

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, хто ўдзельнічае ў танцы на кожным малюнку. Якія інструменты суправаждаюць выкананне беларускага народнага танца? На якім інструменце выконваецца мелодыя рускага танца? З якімі прадметамі ў руках танцуюць японскія жанчыны? Паслухайце некалькі музычных фрагментаў. Здагадайцеся, якому малюнку падыходзіць кожны нумар.



→ Важна сфарміраваць у вучняў уяўленне пра нацыянальную разнастайнасць танцаў: у кожнага народа свая культура, свае танцавальныя традыцыі. Варта звярнуць увагу дзяцей на тое, што танцы бываюць: сольныя, парныя і групавыя; мужчынскія і жаночыя; выкананыя з рознымі прадметамі і г. д. Вучні разглядаюць малюнкі і адшукваюць гэтыя асаблівасці. Для праслухоўвання могуць быць прапанаваны наступныя нумары: беларускі танец "Янка-полька", рускі танец "Барыня", іспанскі танец "Фламенка", традыцыйны танец у кенійскай вёсцы, каўказскі танец "Лезгінка", традыцыйны японскі танец з веерамі. Колькасць музычных фрагментаў вызначае настаўнік.

### Урок 22

***Якія бываюць танцы?***

**С. 86:**

Паслухайце польку. Разгледзьце малюнкі. Якія танцавальныя рухі выконваюць дзеці? Пры паўторным праслухоўванні музыкі прыміце ўдзел у выкананні танца.

**С. 87:**

Паслухайце фрагмент "Італьянскай полькі" Сяргея Рахманінава. Паглядзіце, на якім інструменце акампаніруе (падыгрывае) хлопчык дзяўчынцы, якая іграе на піяніна.

Разгледзьце першую схему і развучыце яе. Выканайце суправаджэнне да полькі Сяргея Рахманінава гучальнымі жэстамі і на бубне.

**С. 88:**

Паслухайце музыку вальса. Апішыце яе. Успомніце, як выглядае схема трохдольнай пульсацыі. Агучце схему з дапамогай гучальных жэстаў.

→ Для праслухоўвання першакласнікам можа быць прапанаваны ўжо знаёмы твор — "Вальс сняжынак" з балета П. Чайкоўскага "Шчаўкунок". Іншыя варыянты музычных твораў па вучэбнай праграме: "Вальс" Д. Кабалеўскага альбо "Вальс старой катрынкі" Л. Мурашкі.

**С. 89:**

Разгледзьце схему. Двухдольная або трохдольная пульсацыя на ёй адлюстравана? Агучце схему: моцныя долі выконвайце на трохвугольніку, слабыя — з дапамогай клавеса (драўляных палачак).

Разгледзьце музычныя інструменты ў рамачцы. Выканайце на розных інструментах двухдольную і трохдольную пульсацыю.

### Урок 23

***Песня ў жыцці чалавека***

**С. 90:**

Разгледзьце малюнкі. Што на іх адлюстравана? Хто і каму спявае песню на кожным малюнку? Выканайце вядомыя вам песні (калыханку; песню, прысвечаную 8 Сакавіка; народную песню).

**С. 91:**

Якую песню выконваюць людзі, прадстаўленыя на малюнку? Паслухайце Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Памятайце, што гімн заўсёды выконваюць і слухаюць стоячы.

**С. 92:**

Разгледзьце малюнак. Звярніце ўвагу, як сядзіць хлопчык (на краі крэсла, спіна прамая, рукі апушчаны на калені, хлопчык глядзіць на настаўніка). Выканайце песню, прытрымліваючыся галоўных правілаў пеўчай пасадкі.

→ Вучні выконваюць песню, запланаваную для развучвання на ўроку. Гэта можа быць "Калыханка" (словы Г. Бураўкіна, музыка В. Раінчыка).

Разгледзьце малюнкі. Паглядзіце, як правільна выконваць галосныя гукі. Патрэніруйцеся ў спевах гукаў [у], [о], [а], а таксама іншых галосных.

**С. 93:**

Разгледзьце малюнак. Хто ўдзельнічае ў выкананні музыкі? Які хор спявае песню? Паслухайце песню ў выкананні дзіцячага хору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




→ Увага вучняў звяртаецца на тое, што ў выкананні музыкі ўдзельнічаюць хор, дырыжор і канцэртмайстар. Выконвае песню хор хлопчыкаў. Вучні слухаюць прапанаваную песню ў выкананні дзіцячага хору. Настаўнік расказвае пра змест песні, характар музыкі.

### Урок 24

***Песня, танец, марш сустракаюцца ў адным музычным творы***

**С. 94:**

Разгледзьце малюнак. Чым займаюцца дзеці? Выканайце рускую народную песню "Во поле березка стояла". Паглядзіце, як рухаюцца гукі ў мелодыі.

→ Увага першакласнікаў звяртаецца на тое, што дзеці на малюнку не проста спяваюць песню — яны водзяць карагод. Гэта яскравы прыклад аб'яднання двух жанраў — двух "кітоў" (песні і танца). Пры інтанаванні мелодыі можа быць выкарыстаны прыём пластычнага інтанавання. Пасля выкарыстання дадзенага прыёму вучні разглядаюць прадстаўлены бярозавымі лісточкамі графічны запіс мелодыі і аналізуюць яго.

**С. 95:**

Разгледзьце схемы вядзення карагода. Чым яны адрозніваюцца? Выканайце песню "Во поле березка стояла", вядзіце карагод па-рознаму на кожны куплет.

→ Вучням неабходна загадзя дамовіцца, як яны будуць вадзіць карагод на розныя куплеты песні: змяняючы кірунак руху, змейкай, арганізаваўшы карагод адзін у адным або пабудаваўшы некалькі карагодаў.

**С. 96:**

Выканайце песню "Бравыя салдаты" (словы Т. Волгінай, музыка А. Філіпенкі). Падумайце, з якім настроем яе трэба спяваць.

Разгледзьце схемы ігры на барабанах. Развучыце спачатку першую схему, затым — другую. Упрыгожце песню ігрой на барабанах.

→ Калі ў класе няма дастатковай колькасці інструментаў, праца можа быць арганізавана з выкарыстаннем палачак (алоўкаў). У гэтым выпадку мембранай барабана будзе служыць парта. Дадзены падыход дазволіць уключыць у работу ўвесь клас.

**С. 97:**

Прыгадайце і выканайце папеўку Дзмітрыя Кабалеўскага "У нашым класе". Колькі "кітоў" сустракаецца ў дадзеным творы? Які "кіт" з'яўляецца ў гэтым творы два разы? Успомніце і выканайце творы, у якіх "кіты" сустракаюцца разам. Суправаджайце выкананне песень гучальнымі жэстамі.

### Урок 25

***Абагульняючы ўрок па тэме "З чаго вырасла музыка?"***

**С. 98:**

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, як з часам змянялася музыка. Раскажыце, якая музыка вам падабаецца. Пафантазіруйце, якую музыку будуць складаць, выконваць і слухаць у будучыні.

**С. 99:**

Разгледзьце малюнкі. Якіх "кітоў" на іх вы пазналі? Успомніце, якія песні, танцы і маршы вы выконвалі і слухалі на працягу чвэрці? Назавіце свае любімыя песні. Выканайце іх класам.




**В. В. КАВАЛІЎ,**
дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка;
**М. Б. ГАРБУНОВА,**
метадыст вышэйшай катэгорыі аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі НІА.

*(Заканчэнне будзе.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ